3. Brzezinski, Z. The cold war and its after-math / Z. Brzezinski // Foreign Affairs. – N.Y. – 1992. – Vol. 71. – № 4. – P. 44.

4. Божанов, В .А. Восхождение к абсолютной власти: Большевики и советское государство в 20-е годы / В.А. Божанов. – Минск: Тесей, 2004. – 272 с.

5. Галкин, А. А. Перестройка с дистанции в три десятилетия / А.А. Галкин, Ю. А. Красин // ПОЛИС. – 2015. – № 5. – С. 160-173.

6. Фурман, Д. Российские демократы и распад Союза / Д. Фурман // Век XX и мир. – 1992. – № 1. – С. 16.

## ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАЦЭСА УТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ПРАЦАХ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 50-х – СЯРЭДЗІНЫ 80-х гг.

Райчонак А. А. г. Мінск, БДТУ

У гістарыяграфіі ўтварэння беларускай дзяржаўнасці XX стагоддзя можна вылучыць чатыры асноўныя перыяды: 1) гістарыяграфія 20-х гг.; менавіта ў гэтыя гады быў закладзены падмурак савецкай гістарыяграфіі дзяржаўнасці Беларусі. З агульна-метадалагічных праблем, характэрных для гэтага перыяду, на наш погляд, галоўнымі з’яўляюцца: блізкая адлегласць публікацый ад падзей, якія ў іх аналізаваліся, што ў поўнай меры не давала магчымасці ацаніць гістарычную значнасць тых ці іншых фактаў, і пэўная ідэалагічная ангажаванасць іх аўтараў, што ў сваю чаргу, замінала непрадузята ацэньваць як свае ўласныя дзеянні, так і дзеянні сваіх палітычных апанентаў; 2) гістарыяграфія 30-х – першай паловы 50-х гг. Характарызуючы ўвесь перыяд 30-х – пачатку 50-х гг., можна зазначыць, што ён з’явіўся крокам назад у параўнанні з гістарыяграфіяй 20-х гадоў, якая, і сама не была пазбаўлена пэўных недахопаў. Для прац 30-х – 50-х гадоў, якія тычацца праблем станаўлення беларускай дзяржаўнасці, характэрна падмена канкрэтнага гістарычнага аналізу этапаў нацыянальна- дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі агульнымі разважаннямі на тэму права народаў на самавызначэнне; успрыманне гісторыі праз паняцці “рэвалюцыйнае – контррэвалюцыйнае” з залічэннем у апошняе ўсяго таго, што не ўпісвалася ў рамкі афіцыйнай ідэалогіі. Працы гэтых гадоў толькі ўмоўна можна аднесці да навуковых, бо галоўнай іх мэтай

было ідэалагічнае абслугоўванне набіраючых абарот рэпрэсій. Усе яны былі напісаныя з пазіцый ваяўнічага бальшавізму і абсалютнай нецярпімасці да палітычных апанентаў, з мэтай дыскрэдытацыі якіх лічылася магчымым прыбягаць да іх шальмавання і фальсіфікацыі гістарычных фактаў; 3) перыяд другой паловы 50-х – сярэдзіны 80-х гг., якому прысвечаны дадзены артыкул; 4) гістарыяграфію часоў "перабудовы" і першых гадоў існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь У гэты час асноўнымі тэмамі даследавання становяцца пераасэнсаванне часткі сюжэтаў з гісторыі КПСС і вяртанне ў гісторыю неабгрунтавана рэпрэсіраваных асоб. Папулярнымі становяцца "круглыя сталы" гісторыкаў, матэрыялы якіх друкаваліся ў перыядычным друку ці зборніках артыкулаў. У іх назіраюцца першыя спробы пераасэнсавання такіх важных для гісторыі Беларусі пытанняў, як развіццё нацыянальнага руху ў Беларусі напачатку XX ст; стварэнне БНР і БССР; ідэйная барацьба вакол шляхоў вырашэння праблемы беларускай дзяржаўнасці і інш. У навуковы ўжытак уводзяцца новыя архіўныя крыніцы, якія раней былі недаступныя для гісторыкаў.

Трэба зазначыць, што пасля XX-га з'езда КПСС, які выкрыў культ асобы Сталіна і ўзяў курс на пэўную дэмакратызацыю, пачынае паступова змяняцца і сітуацыя ў беларускай гістарычнай навуцы. У параўнанні з папярэднім перыядам узрастае не толькі колькасць публікацый, але змяняецца іх змест і тон характарыстык.

Даследаванні пачынаюць весціся па некалькіх накірунках. З'яўляецца цэлы шэраг прац гісторыкаў і юрыстаў, прысвечаных дзяржаўнаму будаўніцтву БССР, утварэнню органаў улады, дзейнасці Саветаў, партыйных і дзяржаўных органаў [1-4]. Вядзецца даследаванне ваенна-палітычнага становішча на Беларусі ў 1917 – 1920 гадах і абумоўленых гэтым, асаблівасцяў ідэалагічнай барацьбы [5-9].

Распачаты пасля XX-га з'езда КПСС працэс рэабілітацыі часткі ахвяр палітычных рэпрэсій выклікаў, з аднаго боку, цікавасць да іх лёсу, што знайшло адлюстраванне ў гістарычнай літаратуры [0-12], а з другога, прывёў да гістарычнай рэабілітацыі левага крыла беларускага нацыянальнага руху. Але трэба зазначыць, што дадзены працэс адбываўся ў беларускай гістарычнай навуцы больш маруднымі тэмпамі чым, напрыклад, у РСФСР. Так для большасці з узгаданых прац характэрна захаванне падзелу на "рэвалюцыйны" і

"контррэвалюцыйны" накірункі, у той час, як большасць савецкіх гісторыкаў пачынае пераходзіць на больш гнуткае "трохлагернае" дзяленне накірункаў (дэмакратычны, ліберальны, рэакцыйны) у гісторыі развіцця палітычнага руху ў пачатку ХХ стагоддзя, (хаця на падзей пасля 1917 г. такі падыход ужо не распаўсюджваўся).

Больш грунтоўныя працы пачынаюць з'яўляцца з другой паловы 60-х гадоў. У гэты час, фактычна ўпершыню, аб'ектам навуковага даследавання становіцца беларуская нацыя. У 1969 г. выходзіць праца Я.І. Карнейчыка "Беларуская нацыя" [13], але часткі кнігі, прысвечаныя беларускаму нацыянальнаму руху і стварэнню дзяржаўнасці, утрымліваюць тыя ж падыходы, што і ўзгаданыя вышэй працы: аднабаковасць ацэнак, а часам і скажэнне фактаў.

Таксама доўгі час па-за межамі інтарэсаў гісторыкаў заставалася і тэма дзейнасці непралетарскіх партый. Адным з першых дадзеную тэму ўзняў А.М. Малашка [14]. У сваёй манаграфіі ён паспрабаваў прааналізаваць стратэгію і тактыку бальшавіцкай партыі ў дачыненні да дробнабуржуазных партый і прычыны ўсталявання ў СССР аднапартыйнай сістэмы.

Даследавалася нацыянальная палітыка палітычных партый, што дзейнічалі ў Беларусі да ўтварэння БССР, і іншымі навукоўцамі [15, 16]. Увогуле, што тычыцца прац, прысвечаных непасрэдна праблеме станаўлення беларускай дзяржаўнасці, то доўгі час даследчыкі засяроджвалі сваю ўвагу амаль выключна на працэсе ўтварэння БССР, прычым гэтая падзея падавалася як нейкі падарунак цэнтральнага кіраўніцтва ВКП(б) беларускаму народу, пры гэтым беларускі нацыянальны рух не браўся пад увагу.

Пэўны прарыў у гэтым накірунку зрабілі працы гісторыка дзяржавы і права В.А. Круталевіча.У сваіх публікацыях аўтар імкнуўся прааналізаваць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары, што абумовілі ўзнікненне Беларускай Савецкай Рэспублікі, раскрыць формы праяўлення волі беларускага народа да нацыянальнага самавызначэння, прасачыць працэс утварэння органаў улады і фарміравання тэрыторыі. Найбольш грунтоўна гісторыя станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці прадстаўлена ў манаграфічных работах В. А. Круталевіча, якія выйшлі ў свет у 1973-1979 гадах [17-19]. Аўтара вылучае глыбокі прафесіяналізм, шырокае выкарыстанне архіўнага матэрыялу, аналіз публікацый перыядычнага друку. Фактычна ўпершыню ім была ажыццеўлена

спроба комплекснага даследавання працэсу станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Для гістарыяграфіі беларускай дзяржаўнасці 70-х гадоў "Рождение Белорусской Советской Республики" з'яўляецца фундаментальнай працай, праўда, у сувязі з пэўнай ідэалагічнай заангажаванасцю, каштоўнасць яе для сучаснасці зніжаецца.

Выклікаюць цікавасць і працы гісторыка І.М. Ігнаценкі, створаныя ў гэты перыяд. Так, ім упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі быў прааналізаваны сацыяльна-класавы склад удзельнікаў І Ўсебеларускага з'езда. Даследаваўся ім і працэс эвалюцыі палітычных партый пасля Лютаўскай рэвалюцыі, выкрышталізацыі іх палітычных патрабаванняў і паглыблення ідэалагічных размежаванняў [20, 21].

Значны ўклад у вывучэнне гісторыі палітычных партый Беларусі і гісторыі ідэалагічнай барацьбы падчас станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў 1917- 1925 гг. унёс М. С. Сташкевіч. Работы гэтага аўтара адрозніваюцца шырокім выкарыстаннем раней малавядомых архіўных дакументаў. Характарызуючы стратэгію і тактыку палітычных партый, М.С.Сташкевіч звяртае асаблівую ўвагу на іх нацыянальныя праграмы. У яго манаграфіях і артыкулах змяшчаецца багаты матэрыял, які раскрывае асноўныя рысы і асаблівасці нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі ў 1917-1925 гадах. Аўтар даследуе таксама шырокае кола праблем нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, паказвае, як ствараўся грунт нацыянальнай дзяржаўнасці беларускага народа [22-24].

Калі характарызаваць дадзены перыяд увогуле, то можна зазначыць, што ў ім адбываецца паступовае вяртанне да навуковага вывучэння гісторыі Беларусі, праўда, абмежаванага "прынцыпам партыйнасці".

Нягледзячы на ўвядзенне ў навуковы ўжытак мноства новых дакументаў, значная частка, змешчаная ў "спецфондах" архіваў і "спецсховах" бібліятэк, заставалася недасягальнай для даследчыкаў. Фактычна немагчыма было выкарыстаць і працы замежных гісторыкаў.

Вышэйпералічаныя абставіны прыводзілі да значных недахопаў у работах канца 50-х – 80-х гг. Сярод асноўных недахопаў можна вылучыць наступныя: пэўныя падзеі ці асобы, узгадваць пра якія было нязручна, проста не траплялі на старонкі даследаванняў; частка з'яў асвятлялася толькі ў негатыўным святле (напрыклад, абвяшчэнне БНР ці дзейнасць палітычных апанентаў бальшавікоў),

затое, напрыклад, дзейнасць цэнтральнага кіраўніцтва ВКП(б) знаходзілася па-за межамі крытыкі; на шмат якія пытанні проста не было адказу, калі яны не ўпісваліся ў адпаведныя ідэалагічныя штампы. Ад гісторыкаў патрабавалася пастаянна спасылацца на класікаў марксізму ў якасці доказу. Усё гэта прыводзіла да таго, што гісторыя аказвалася няпоўнай, а, значыць, і не аб’ектыўнай, хаця ў параўнанні з папярэднім перыядам, магчыма канстантаваць пэўны прагрэс. Тым не менш гэта быў час назапашвання матэрыялу, які ў далейшым будзе пакладзены ў падмурак сучаснай гістарыяграфіі беларускай дзяржаўнасці XX ст.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**


1. Вихарев, С.Р. Суверенитет БССР в составе СССР /С.Р. Вихарев. – Минск: Изд-во БГУ, 1958. – 128 с.

2. Маргунский, С. П. Создание и упрочение белорусской государственности / С.П. Маргунский. – Минск: Изд-во АН БССР, 1958. – 258 с.

3. Петриков, П.Т. Ревкомы Белоруссии / П.Т. Петриков. – Минск: Наука и техника, 1975. – 287 с.

4. Маргунский, С.П. Интернациональное и национальное в государственном строительстве Белоруссии (1917–1922 гг.) / С.П. Маргунский, Л.И. Кукреш. – Минск: Наука и техника, 1978. – 223 с.

5. Каменская, Н.В. Белоруский народ в борьбе за Советскую власть. 1919–1920 гг. /Н.В. Каменская. – Минск: Изд-во АН БССР, 1963. – 263 с.

6. Победа Советской власти в Белоруссии. – Минск: Наука и техника, 1967. – 506 с.

7. Жмуровский, Д.П. Организаторская работа Коммунистической партии в деревне / Д.П. Жмуровский. – Минск: Изд-во БГУ, 1970. – 344 с.

8. Мурашко, П.Е. Особого назначения... Из истории ЧОН Белоруссии. 1918–1924 / М.Е. Мурашко. – Минск: Изд-во БГУ, 1979. – 102 с.

9. Хохлов, А.Г. Крах антисоветского бандитизма в Белоруссии в 1918–1925 гг. / А.Г. Хохлов. – Минск: Беларусь,1981. – 171 с.

10. Якутов, В.Д. А. Г. Червяков. Страницы биографии / В.Д. Якутов. – Минск: Беларусь, 1978. – 156 с.

11. Кузнецов, Н.В. В. Г. Кнорин. Страницы биографии / Н.В. Кузнецов. – Минск: Беларусь, 1979. – 172 с.

12. Ялугін, Э.В. Без эпітафіі. Дакументальная аповесць / Э.В. Ялугін. – Минск: Беларусь, 1989. – 254 с.

13. Карнейчык, Я.І. Беларуская нацыя: Гістарычны нарыс / Я.І. Карнейчык. – Минск: Навука і тэхніка,1969. – 308 с.

14. Малашко, А.М. К вопросу об оформлении однопартийной системы СССР / А.М. Малашко. – Минск: Изд-во БГУ, 1969. – 320 с.

15. Засинец, В.П. Борьба большевиков Белоруссии против мелкобуржуазных партий (октябрь 1917 – январь 1919 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / В.П. Засинец; Ин-т истории партии при ЦК КПБ. – Минск, 1973. – 29 с.

16. Липецкий, Э.А. Борьба большевистских организаций Белоруссии с мелкобуржуазными партиями в период подготовки и проведения Великой Октябрьской социалистической революции (март 1917 – январь 1918): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / Э.А. Липецкий; БГУ. – Минск, 1973. – 19 с.

17. Круталевич, В.А. Провал контрреволюционных планов создания белорусского буржуазного государства н образование БССР (октябрь 1917 – февраль 1919): автореф. дис. ... канд. д-ра юрид. наук: 12.00.01 / В.А. Круталевич; БГУ. – Минск, 1973. – 48 с.

18. Круталевич, В.А. Рождение Белорусской Советской Республики. (На пути к провозглашению республики, октябрь 1917 – декабрь 1918 г.) / В.А. Круталевич. – Минск: Наука и техника, 1975. – 334 с.

19. Круталевич, В.А. Рождение Белорусской Советской Республики. (Провозглашение республики. Развертывание национально-государственного строительства. Ноябрь 1918 – февраль 1919 г.) / В.А. Круталевич. – Минск: Наука и техника, 1979. – 334 с.

20. Игнатенко, И.М. Беднейшнее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии / И.М. Игнатенко. – Минск: Изд-во Министерства высшего, среднего специального и профессионального образования БССР, 1962. – 497 с.

21. Игнатенко, И.М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии / И.М. Игнатенко. – Минск: Наука и техника, 1986. – 344 с.

22. Сташкевич, Н.С. Непазбежнае банкруцтва: з гісторыі краху нацыялістычных партый у Беларусі. 1917–1925 гт. / Н.С. Сташкевич. – Мінск, 1974. – 140 с.

23. Сташкевич, Н.С. На пути к истине: Из истории национально-освободительного движення в Белоруссии. 1917 год / Н.С. Сташкевич. – Минск, 1983. – 125 с.

24. Сташкевич, Н.С. Приговор революции: Крушение антнсоветского движения в Белоруссии: 1917–1925 / Н.С. Сташкевич. – Минск: Университетское, 1985. – 302 с.

## АВТОБИОГРАФИИ В ПАМЯТИ О СОВЕТСКОЙ ИСТОРИИ: ЖЕНСКИЕ РАССКАЗЫ О ВОЙНЕ

Рогач С. А. г. Минск, БНТУ

Целью данного исследования было рассмотрение взаимосвязи и отличий общепринятых трактовок истории и индивидуальных переживаний тех людей, которые оказались лично включенными в процесс исторических катаклизмов. Работа строилась по материалам интервью с двумя женщинами-родственницами по поводу их воспоминаний о Великой Отечественной войне.

Методологической опорой для данного исследования послужил синтез биографического метода (на основе глубинного интервью), устной истории, герменевтического подхода и дискурс-анализа.

Исследование основано на сборе и анализе материалов интервью, взятых из аудио и видеозаписей – в зависимости от выбранного собеседницами варианта – у двух моих старших родственниц (в 2012-2015 гг.). Беседы касались воспоминаний о лично пережитом ими во время Великой Отечественной войны. Первые интервью проводились с родной бабушкой – Софией Герасимовной Масарновской (1919-2015 гг.), а затем – с ее сестрой Клавдией Герасимовной Канашевич (род. в 1929 г.) (фамилии обеих по рождению – Ситник). Транскрибирование записей делалось без лингвистических исправлений.

С самого начала исследования женщинам была предоставлена возможность свободно строить свои воспоминания с собственными интерпретациями важных, по их мнению, событий. Данный метод исследования можно отнести к использованию эго-документов